# Звальненне ў адпачынку

*«На дадзены момант знаходжуся ў працоўным адпачынку, за гэты час знайшоў іншую, больш аплачваемую працу. Ці магу я звольніцца, знаходзячыся ў адпачынку, па ўласнай ініцыятыве?»*

У перыяд знаходжання работніка ў працоўным адпачынку ён можа быць звольнены па любых падставах, прадугледжаных заканадаўствам аб працы: напрыклад, па пагадненні бакоў, у парадку пераводу да іншага наймальніка, па жаданні работніка, у сувязі з заканчэннем тэрміну дзеяння тэрміновага працоўнага дагавора і г. д.

Згодна з часткай другой артыкула 43 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей – ПК) не дапускаецца звальненне работніка ў перыяд яго знаходжання ў адпачынку па ініцыятыве наймальніка (арт. 42 ПК), за выключэннем звальнення па пункце 6 артыкула 42 ПК і звальнення па п. 1 арт. 42 ПК, у сувязі з ліквідацыяй арганізацыі, спынення дзейнасці філіяла, прадстаўніцтва ці іншага адасобленага падраздзялення арганізацыі, размешчаных у іншай мясцовасці, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка.

Вяржынская Таццяна,
галоўны дзяржаўны інспектар
Смаргонскага міжраённага аддзела
Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай
інспекцыі працы